Самахвалаў, Дз. С. Гістарычная ідэнтычнасць і яе асвятленне ў беларускай гістарыяграфіі / Дз. С. Самахвалаў // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 137-139

**Дз. С. САМАХВАЛАЎ (Мінск)**

# ГІСТАРЫЧНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ І ЯЕ АСВЯТЛЕННЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Паняцце «ідэнтычнасць» (identity) літаральна азначае «тоеснасць» і на сённяшні час даволі шырока ўжываецца рознымі даследчыкамі, у тым ліку сацыёлагамі, псіхолагамі, антраполагамі і этнолагамі. У гістарычных працах паняцце «ідэнтычнасць» сустракаецца пакуль адносна рэдка. Аднак дыскусіі аб гістарычнай і сацыяльнай памяці, індывідуальных якасцях гістарычнага аб'екта і зменах у ментальнасці грамадстваў і людзей пэўных адрэзкаў часу кажуць пра патрэбу ў больш дасканалым метадалагічным забеспячэнні тэрміналагічнага апарату даследаванняў.

У паўсядзённым вымярэнні ідэнтычнасць — гэта тое, што адказвае на пытанне: кім з'яўляецца яе носьбіт? Фактычна гэта форма гістарычнай індывідуальнасці кожнай асобы, вынік яе разумення сябе ў навакольным свеце [2]. Адзін з пачынальнікаў эгапсіхалогіі і прыхільнік шырокай інтэграцыі гісторыі і псіхалогіі Э. Г. Эрыксан прапаноўваў разглядаць ідэнтычнасць як неад'емную ўласцівасць цэласнасці чалавечага Я. Для Э. Г. Эрыксана чалавечая ідэнтычнасць — гэта не проста тоеснасць, а разуменне ці адчуванне сваёй значнасці ў вачах іншых людзей [6, 367].

У навуковым вымярэнні ідэнтычнасць уяўляе сабой псіхалагічную і сацыяльную канструкцыю, якая будуецца індывідуумам на працягу ўсяго жыцця і дазваляе яму вызначыць сваё месца ў грамадстве ў залежнасці ад існуючых у ім чыннікаў. Амерыканскі сацыёлаг М. Каслс дае вызначэнне ідэнтычнасці як працэсу пастаяннага стварэння значнасці сацыяльна-культурных атрыбутаў, у якім асноўнае месца займаюць перавагі пры выбары прапануемых роляў [7, 6]. Такім чынам, пад гістарычнай ідэнтычнасцю мы можам разумець як асаблівасці сацыяльнага і індывідуальнага самавызначэння ў пэўны адрэзак мінулага, так і даволі шырокі комплекс атрыбутаў, што дазваляюць арыентавацца ў геаграфічнай прасторы і часе, у тым ліку гістарычную памяць, пэўны стыль паводзінаў і стымулы для далейшага гістарычнага развіцця.



Беларуская нацыянальная гістарыяграфія фарміравалася ў пачатку XX ст. пад моцным уплывам ідэі вызначэння гісторыі як неад'емнай часткі нацыянальнага самаўсведамлення. В. Ластоўскі вызначаў гэта наступным чынам: «Гісторыя — гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундамента, каб будынак быў моцным» [1, 5]. Але нават у 1920-х гг. яшчэ не існавала адзіных падыходаў да метадалогіі гістарычнага апісання нават у рамках нацыянальнай ідэі. М. Доўнар-Запольскі, У. Пічэта, У. Ігнатоўскі кіраваліся распаўсюджаным у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі правілам першаснага даследавання дзяржаўнасці і дзяржаўных інстытутаў. Сярод навукоўцаў таго часу існавала цікавасць да рэгіяналізму і этнаграфіі. Марксізм мог прапанаваць якасна іншы класавы падыход, аднак савецкі варыянт марксізму дазваляў у дачыненні да нацыянальных гістарыяграфій некаторы адыход ад класічных поглядаў з абавязковым падкрэсліваннем станоўчай ролі Расіі і рускага народа ў гісторыі мясцовых зямель. У падобнай сітуацыі само гістарычнае апісанне з'яўлялася справай складанай і нават рызыкоўнай. Вызначэнне ж пэўных гістарычных чыннікаў у дачыненні да людзей мінулага, акрамя дзяржаўных, нацыянальных ці класавых, проста не праводзілася.

Працы М. Улашчыка (1906—1986) у значнай ступені раскрываюць праблему цяжкасцей у пошуке вызначэння ідэнтычнасці ў гістарычным даследаванні. Яго асабісты вопыт падлеткавай і юнацкай сацыялізацыі прыпаў на час значных перамен. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне новых грамадскіх інстытутаў, адукацыя ў БДУ і праца ў бібліятэцы — усё гэта адбілася на яго светаўспрыманні. Да гэтага трэба дадаць цікавасць да краязнаўства і багаты вопыт асабістых назіранняў. Нягледзячы на рэпрэсіі, ён заставаўся прыхільнікам нацыянальнай ідэі гісторыі, што ў будучым стварала сур'ёзныя праблемы ва ўспрыманні «афіцыйнай» беларускай гістарыяграфіі [5]. М. Улашчык добра разумеў адрозненні грамадстваў мінулага ад сучаснасці, яго падзел на саслоўі і палітычныя групы, але ніколі не выносіў дадзеныя чыннікі ў аснову даследчых інтарэсаў. Ён бачыў прыкметы нацыянальнай матывацыі нават у XVI ст. У значнай ступені дзякуючы яму ў гістарыяграфію ўвайшло паняцце «беларуска-літоўскае летапісанне».

У 1970—1980-я гг. заходнееўрапейская і амерыканская навука паступова перайшлі да вывучэння індывідуальных якасцей мінулага, і пытанне ідэнтычнасці ў гісторыі пачало абмяркоўвацца на акадэмічным узроўні. Змены палітычнай сітуацыі на Беларусі ў канцы 1980 — пачатку 1990-х гг. таксама спрыялі пашырэнню тэматыкі і праблематыкі гістарычных даследаванняў. Так, у першай палове 1990-х гг. адбыліся дыскусіі, прысвечаныя канцэпцыі нацыянальнай гісторыі, этнагенезу беларусаў і ўжыванню новых метадаў і форм даследавання мінулага і сучаснасці. Аднак яны мала паўплывалі на досвед



навукоўцаў, якія працягваюць шукаць толькі нацыянальныя ці сацыяльныя рысы гістарычнага працэсу. Можна канстатаваць праяўленне цікавасці да індывідуальных рысаў гістарычных асоб, але зноў жа пытанне вывучэння іх ідэнтычнасці амаль заўсёды застаецца па-за дужкамі. На Беларусі вядуцца даследаванні, якія тычацца пэўных груп — шляхты, сялян, жанчын, інтэлігенцыі. На жаль, і ў іх не аддаецца перавагі пытанню ідэнтыфікацыі. Між тым гэта пазбаўляе сучаснікаў ад разумення сапраўдных праблем людзей мінулага, іх асабістага вопыту і перажыванняў.

Некаторае выключэнне з апісанай сітуацыі прадстаўляюць сабой манаграфіі С. Токця і В. Насевіча [3, 4], прысвечаныя беларускай вёсцы. Хаця паняцце «ідэнтычнасць» у саміх працах амаль не сустракаецца, аўтары даволі падрабязна спыняюцца на праблемах сацыялізацыі і пошуках атаясамлення. У немалой ступені гэтаму садзейнічае якасна новы падыход да гістарычнага апісання.

Яны пачынаюць яго з мікрагістарычнага ўзроўню і толькі потым пераходзяць да макрагістарычнага. Відавочна, што такі шлях даследавання павінен стаць у будычым вызначальным пры разглядзе праблем гістарычнай ідэнтычнасці.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ластоўскі, В. Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ластоўскі. Мінск, 1992.
2. Люббе, Г. Историческая идентичность / Г. Люббе // Вопросы философии. 1999. №4. С. 108—113.
3. Носевич, В. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Носевич. Минск, 2004.
4. Токць, С. Беларуская вёска на мяжы эпох / С. Токць. Гродна, 2003.
5. Улашчык, М. История с… историей / М. Улашчык / Выбранае. Мінск, 2001.С. 161—168.
6. Эриксон, Э. Г. Детство и общество / Э. Г. Эриксон. СПб., 1996.
7. Castells, M. The Power of Identity / M. Castells. Los Angeles, 2004.